ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

выдаецца з 1 мая 1935 г.

1980 г.
10
СТУДЗЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 1 (1265)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## НАВІНЫ БДУ

### ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

ўсесаюзнага конкурсу на лепшую навуковую работу студэнтаў па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках. Кожны год універсітэт прадстаўляў на агляд лепшыя работы, даследаванні студэнтаў, якія заслугоўвалі значнай увагі. Сведкай гэтага сталі яшчэ пяць работ, тры з якіх былі адзначаны дыпломамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК ВЛКСМ і дзве — дыпломамі Усесаюзнага савета навукова-тэхнічнага таварыства.

### АДКРЫЛАСЯ АБЛАСНАЯ

навукова-тэхнічная выстаўка творчай моладзі ў памяшканні Беларускага навукова-даследчага інстытута тэхнічнай інфармацыі. Сярод экспанатаў па навуцы, сельскай гаспадарцы, радыётэхніцы, прамысловасці, транспарту выклікаюць цікавасць работы васьмі маладых вучоных і студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна. Значнай увагі заслугоўвае «Універсальны лабараторны стэнд для вывучэння элементаў вузлоў і прыстасаванняў радыёэлектронікі», прадстаўлены студэнтамі кафедры ядзернай фізікі фізічнага факультэта.

### У МЯСЦКОМЕ

універсітэта заканчваецца работа па падвядзенню вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва сярод мясцовых камітэтаў факультэтаў, кафедр. Пераходны Чырвоны сцяг і грамата чакаюць пераможцаў, якія зоймуць першае месца. Акрамя гэтага, падрыхтаваны 60 значкоў «Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва», 76 значкоў «Ударнік камуністычнай працы».

### ПЕРШАЕ МЕСЦА

сярод факультэтаў па нагляднай агітацыі па выніках сацыялістычнага спаборніцтва 1979 года заняў факультэт журналістыкі. Шмат увагі гэтаму пытанню аддаюць на факультэце. Стэнды, дыяграмы, фотавыстаўкі складаюць адзіную комплексную тэматыку па выхаванню ў студэнтаў маральна-эстэтычных поглядаў, павышэнню ідэйнага ўзроўню.

ЯК ЖЫВЕШ, СНТ!

## НА ЛЕПШЫХ ТРАДЫЦЫЯХ

СТУДЭНЦКАЯ навуковая работа займае вялікае месца ў сістэме падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. Яна ўключае ў сябе падрыхтоўку дакладаў для навуковых гурткоў, спецсемінараў, напісанне курсавых работ. 3,5 стагоддзя прайшло з таго часу, як Ф. Бэкон назваў навуку сілай. Што можа даць студэнт для навукі, як шырэй прыцягнуць студэнтаў малодшых курсаў у навуковую работу, дапамагчы ім раскрыць сябе — вось асноўныя задачы, якія стаяць перад студэнцкім навуковым таварыствам (СНТ) гістарычнага факультэта. Па выніках VII Усесаюзнага конкурсу па грамадскіх навуках 7 нашых студэнтаў сталі яго лаўрэатамі. Аднак большасць работ, накіраваных на конкурс, былі напісаны выпускнікамі наша факультэта. Есць у нас такія рабяты, якія паставілі навуковую работу мэтай свайго жыцця. Сярод іх — Анатоль Рубанаў, Аляксандр Грыцанаў, Віктар Вабішчэвіч, Аляксандр Шлопак, Міхаіл Стралец. Павялічваецца колькасць навуковых гурткоў. Зараз 28 гурткоў ахопліваюць 350 чалавек гістарычнага факультэта. Але што хаваецца за гэтай лічбай?

Памятаю першае ў гэтым годзе пасяджэнне навуковага гуртка па праблемах міжнароднага рабочага і нацыянальна-вызваленчага руху. Узначальвае гурток В. Кожалеў, чалавек з творчым падыходам да справы, які здольны запаліць цікавасць да хвалюючых нас праблем. Быў прадстаўлены на разгледжанне адзін даклад «Аб праблемах адставання краін Азіі і Афрыкі». Колькі гарачых спрэчак разгарэлася вакол гэтай праблемы, колькі пытанняў было зададзена дакладчыку! Думаецца, у такім напрамку трэба працаваць і іншым гурткам. Пашыраюцца і знешнія сувязі. На XXXVI навуковую канферэнцыю былі запрошаны студэнты з Ужгарада, Ерэвана, Вільнюса.

Разам з тым, нельга не заўважаць недахопы, якія яшчэ сустракаюцца. Перш за ўсё — слабая матэрыяльная дапамога нашай навуковай арганізацыі. Хацелася б бачыць і больш энтузіястаў гэтай справы. Думаецца, наша студэнцкае навуковае таварыства і яго абноўлены савет паспяхова вырашаць пастаўленыя перад ім задачы. Тым больш, што для гэтага ёсць спрыяльныя ўмовы — традыцыі факультэта.

**А. РЭЗНІК,**
**студэнт III курса гістфака.**

## ВЕЧНАЯ СЕСІЯ

ФОТАРЭПАРТАЖ



...ПАЗАЎЧОРА — СЕСІЯ, учора — сесія, сёння — сесія. Гэта чуў ад многіх студэнтаў.

— ...Хутчэй бы сесія, хутчэй бы здаваць экзамены, хутчэй бы атрымаць пяцёрку (чацвёрку, тройку, залік). Гэтага ні аднаго разу не чуў. Сціплы народ студэнты.

— Вой, нічагуткі не ведаю. Чытаў, чытаў, а ў галаве — ні-ні...

Гэта перад аўдыторыяй.

І што вы думаеце? Заходзіць да экзаменатара і пачынае упэўніваць прафесара ў адваротным. І небеспаспяхова. Вы-

(Заканчэнне на 3-й стар.).

СУСТРЭЧЫ

## У ДОБРЫ ЧАС, БУДУЧЫЯ ЖУРНАЛІСТЫ!

У ГЭТЫ дзень наш куратар В. І. Дубовік паведаміў, што на журфаку чакаюць госця Юрыя Міхайлавіча Сапажкова, карэспандэнта АДН па Беларусі, старшыню секцыі публіцыстыкі Саюза журналістаў БССР. Адразу мы адчулі, што гэты чалавек прыйшоў да нас не дзеля таго, каб выступіць і пайсці. Ён прыйшоў, каб зацікавіць, усхваляваць праблемамі сучаснай публіцыстыкі (ды і ўсёй журналісцкай дзейнасці), зазірнуць у нашы душы, разварушыць нас. І мы, вельмі занятыя, перагружаныя усялякімі сходамі, на дзве гадзіны адключыліся ад тэорыі, ад канспектаў, ад лекцый. Потым мая сяброўка прызналася:

— Ведаеш, адразу я проста сядзела і слухала, а потым адчула, што гэты чалавек улюбёны ў сваю справу і гэту улюбёнасць ён імкнецца перадаць, імкнецца запаліць у кожнага агеньчык пошуку...

Юрый Міхайлавіч расказаў аб праблемах беларускай публіцыстыкі і журналісцкім майстэрстве, заўважыў, што вельмі важна знайсці падыход да чалавека, аб якім будзеш пісаць.

Кожны з нас, будучых журналістаў, на думку Юрыя Міхайлавіча, павінен імкнуцца да вяршынь журналісцкай справы, да яе тонкасцей. Для гэтага трэба часцей пісаць. І кожная спроба — крок да майстэрства.

**А. ЖОЛУДЗЬ,**
**студэнтка I курса журфака.**

РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ

## ДАВЕР'Е КАЛЕКТЫВУ

З ІРЫНАЙ НАСКЕВІЧ, студэнткай I курса гістарычнага факультэта я сустрэўся ў інтэрнаце. Нягледзячы на позні час, разам з сяброўкай Алай Навумчык яна абмяркоўвала некаторыя пытанні, звязаныя з выкананнем асабістых комплексных планаў камсамольцаў.

Не памыліліся аднакурснікі, выбіраючы Ірыну сваім камсоргам. Убачылі ў яе характарны рысы добрага арганізатара, чулага таварыша.

— Не ведаю, што б мы рабілі без яе, — гаворыць Ала Навумчык. — Яе аўтарытэт складваецца таксама і з высокай патрабавальнасці да сябе, да кожнага камсамольца. Гэтага ў яе не адняць.

А поспех, як вядома, прыходзіць там, дзе кіпіць работа, дзе пануе атмасфера ўзаемаразумення. У поўнай меры гэта можна аднесці да IV групы, якая нядаўна заняла першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве на курсе, з'яўляецца адной з лепшых на факультэце.

Добра зарэкамендавала сябе Ірына на Баранавіцкай баваўнянай фабрыцы, дзе працавала кантралёрам якасці. І таму, калі падала заяву аб накіраванні на вучобу ва універсітэт, рашэнне партыйнай арганізацыі было адзіным. Самыя свежыя ўспаміны засталіся ад падрыхтоўчага аддзялення, дзе рыхтавала сябе да студэнцкай дзейнасці. Ніколі не стаяла ў баку ад грамадскіх спраў. Дапамагала выпускаць насценную газету, старанна выконвала абавязкі члена камсамольскага бюро групы.

— Напэўна ўся сутнасць нашай дзейнасці ў тым, — заўважае Ірына, — каб своечасова адгукнуцца на любое пытанне дня, любую праблему.

**С. БАГДАНОВІЧ,**
**студэнт журфака.**

«...дабівацца арганічнага адзінства навучальнага і выхаваўчага працэсаў, фарміравання ў навучэнцаў і студэнтаў навуковага светапогляду, высокіх маральна-палітычных якасцей, працавітасці. Прывіваць навучэнскай моладзі цікавасць да палітычных ведаў, усямерна развіваць іх грамадскую актыўнасць.»

*(З Пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы»).*

# ТВАЯ АКТЫЎНАЯ ЖЫЦЦЁВАЯ ПАЗІЦЫЯ

**● УВАГА! ЦІКАВЫ ВОПЫТ**

## ВЫСОКАЯ ДЗЕЙСНАСЦЬ

ЗУСІМ НЯДАЎНА была ўведзена ў ВНУ грамадска-палітычная практыка. І ўжо яна зарэкамендавала сябе як эфектыўны сродак фарміравання актыўнай жыццёвай пазіцыі студэнцкай моладзі, падрыхтоўкі яе да выканання складаных і адказных сацыяльных функцый. Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў» нацэльвае на пошук і ўдасканальванне шматлікіх форм і метадаў выхавання ў кожнага студэнта навыкаў будучага выхаваценя і арганізатара, прапагандыста камуністычных ідэй.

На факультэце журналістыкі накоплены значны вопыт арганізацыі грамадска-палітычнай практыкі. За апошнія гады яна значна ўзбагацілася, стала больш канкрэтнай, мэтанакіраванай. Галоўнае ў ёй — узмацненне ідэйнага ўплыву, рашучая барацьба супраць трафарэтнасці, фармалізму ў любых іх праявах, прыцягненне ў грамадскую дзейнасць усіх студэнтаў.

На адным з партыйных сходаў камуністы ўсебакова абмеркавалі і прынялі да дзеяння комплексны перспектыўны план канкрэтных мерапрыемстваў, вызначылі сілы і сродкі рэалізацыі практычных задач. Затым партбюро замацавала за выкладчыкамі функцыі з улікам спецыфікі факультэта, унесла змены ў структуру, удакладніла асноўныя напрамкі работы савета па ГПП і ўвяло ў яго састаў найбольш вопытных і аўтарытэтных выкладчыкаў і камсамольцаў. Ход і вынікі практыкі рэгулярна абмяркоўваюцца на партыйных і камсамольскіх сходах, пасяджэннях партбюро, камітэта камсамола, асвятляюцца ў насценным друку. Пашыраецца ўдзел у арганізацыі практыкі выкладчыкаў грамадскіх навук, спецыяльных і прафіліруючых кафедр, куратараў на аснове творчага ўдасканалення методыкі, забеспячэння арганічнага адзінства навучання і выхавання.

Здзяйсняючы паўсядзённае кіраўніцтва практыкай, партыйная арганізацыя галоўны ўпор робіць на павышэнне яе эфектыўнасці, якасці. Нядаўна па яе ініцыятыве на факультэце прайшоў месячнік ГПП. Атэстацыйныя камісіі арганізавалі вывучэнне студэнтамі новага палажэння аб ГПП, адобранага саветам універсітэта, і прынялі залік у форме індывідуальнага субяседавання. На курсах праведзены камсамольскія сходы з парадкам дня: «Твая актыўная жыццёвая пазіцыя». Адбылася дзелавая, вельмі карысная размова аб грамадскім доўгу камсамольцаў, высокім прызванні журналістаў як актыўных праваднікоў палітыкі партыі, маральна-палітычным абліччы выпускніка вышэйшай школы. Камсамольцы трымалі справаздачу аб выкананні заданняў па ГПП, абавязацельстваў, сфармуляваных у асабістых комплексных планах. Заўважана, што камітэт камсамола, камсамольскія бюро змаглі стварыць на сходах атмасферу прынцыповасці, патрабавальнасці, аб'ектыўнай ацэнкі дасягнутага і нявырашаных задач, нецярплівасці да тых, хто дрэнна ставіцца да вучобы і грамадскай работы.

Для правядзення гутарак у агульнаадукацыйных школах, прафесійна-тэхнічных вучылішчах, вытворчых калектывах сфарміраваны агітацыйна-прапагандысцкія групы; у іх састаў увайшлі найбольш падрыхтаваныя студэнты. Выкладчыкі кафедры гісторыі КПСС, філасофіі, палітычнай эканоміі, навуковага камунізму паклапаціліся аб тым, каб кожны студэнт падрыхтаваў навуковы даклад (рэферат) на актуальную тэму. У лютым адбудзецца конкурс на лепшы навуковы даклад (рэферат). Усім студэнтам будзе прадастаўлена магчымасць выступіць на Ленінскіх чытаннях, якія прысвечаны 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Па ініцыятыве студэнтаў II курса афармлена змястоўнай і маляўнічай нагляднай агітацыяй аўдыторыя грамадска-палітычнай практыкі. Стэнды, якія размешчаны ў ёй, даюць яскравае ўяўленне аб задачах вышэйшай школы на этапе развітога сацыялізму, сістэме арганізацыі ГПП на факультэце, яе мэтах і задачах, прынцыпах, формах і метадах, крытэрыях ацэнкі вынікаў, функцыях выхаваценяў. Студэнтамі былі падрыхтаваны спецыяльныя выпускі насценгазеты, фотагазет.

Месячнік ГПП у многім садзейнічаў павышэнню адказнасці студэнтаў за выкананне асабістых комплексных планаў, развіццю іх творчай ініцыятывы. Мы ўбачылі рэальныя поспехі і недахопы, што важна ва ўмовах падрыхтоўкі да атэстацыі. Можна з упэўненасцю сказаць: нарадзілася новая форма ідэйна-выхаваўчай работы, якая заслугоўвае ўвагі і дазваляе істотна павысіць дзейснасць грамадска-палітычнай практыкі.

Зразумела, прыведзеныя прыклады не даюць падставы да самазадаволенасці. Належыць яшчэ шмат зрабіць. Галоўныя намаганні — наперадзе.

Трэба наладжваць дакладную каардынацыю сіл і сродкаў, дабівацца непарыўнага адзінства вучэбнага і выхаваўчага працэсаў. Важна навучыцца падтрымліваць і ў меру выкарыстоўваць кожную іскру карыснай ініцыятывы, якая зыходзіць ад студэнтаў і выкладчыкаў, грамадскіх арганізацый, кожную крупінку перадавога вопыту. Несумненна, шмат залежыць і ад рашучага пераадолення іннертнасці некаторых выхаваценяў, поўнага ліквідавання фармалізму, які яшчэ сустракаецца ў арганізацыі ГПП. Дзейснасць выхаваўчых мер значна зніжаецца там, дзе ўзнікае разрыў паміж словам і справай, дзе адсутнічае атмасфера прынцыповасці і таварыскай патрабавальнасці пры ацэнцы грамадскай актыўнасці камсамольцаў, не ўлічваюцца інтарэсы і магчымасці студэнтаў.

Ідэйная перакананасць савецкага чалавека, яго палітычная свядомасць, пачуццё грамадскага доўгу праяўляюцца ў грамадска карысных справах. Таму мы бачым сваю галоўную задачу ў тым, каб у поўную меру, з найбольшай эфектыўнасцю выкарыстоўваць магчымасці ГПП для выхавання ў кожным будучым журналісце актыўнай жыццёвай пазіцыі, накіраванасці да высокіх грамадскіх мэт, камуністычных маральна-палітычных якасцей.

**П. БОНДАР,**
**старшыня савета па ГПП, дацэнт.**

## У АРГАНІЧНЫМ АДЗІНСТВЕ

ВОСЬ ужо некалькі гадоў камітэт камсамола гістарычнага факультэта займаецца арганізацыяй ГПП і Ленінскага заліку, улічваючы пры гэтым адзін з галоўных прынцыпаў: арганічнае спалучэнне набываемых тэарэтычных і метадычных ведаў у галіне грамадска-палітычнай работы з выпрацоўкай практычнага ўмення.

Галоўны напрамак нашай работы — прапаганда мэт і задач Ленінскага заліку і ГПП. Вялікая работа вядзецца па распаўсюджванню вопыту лепшых камсамольскіх груп. Ход Ленінскага заліку і ГПП увесь час асвятляецца ў насценным друку факультэта.

Не меншая ўвага аддаецца падбору і вучобе камсамольскага актыву для правядзення Усесаюзнага Ленінскага заліку і ГПП. Ужо створаны і зацверджаны на сумесным пасяджэнні дэканата, партбюро і камітэта камсамола камісіі па арганізацыі і правядзенню Ленінскага заліку і ГПП, атэстацыйна-метадычныя камісіі ва ўсіх групах. Вялікае значэнне ў гэтым плане мае стэнд «Ленінскі залік і ГПП» з метадычнымі распрацоўкамі, якія нядаўна афармлены С. Праскаракавым. Наглядная агітацыя, як паказала практыка, значна садзейнічае павышэнню грамадскай актыўнасці студэнтаў.

У арганізацыі масава-палітычных мерапрыемстваў, якія праводзіліся ў ходзе Ленінскага заліку і ГПП, аказвае дзейсную дапамогу кафедра гісторыі КПСС. Але, на жаль, работнікі кафедры дапамагаюць нам толькі тэарэтычна, не здзяйсняючы ніякіх практычных мерапрыемстваў, напрыклад, чытанне спецкурсаў па ГПП.

Вялікіх поспехаў дабілася наша камсамольская арганізацыя ва ўдасканаленні работы ФГП. Два гады назад мы паставілі перад сабой задачу — дабіцца, каб як мага больш камсамольцаў займалася на факультэце грамадскіх прафесій. І трэба сказаць, што зараз ФГП наведваюць 60 працэнтаў усіх студэнтаў факультэта.

Актыўны ўдзел гістарычны факультэт прыняў у VIII Усесаюзным конкурсе студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ, міжнароднаму маладзёжнаму руху.

Грамадская актыўнасць студэнтаў гістарычнага факультэта праявілася ў арганізацыі паходаў па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы, у правядзенні зорных паходаў.

Вялікую ўвагу камітэт камсамола ўдзяляе рабоце па прыцягненню студэнтаў факультэта ў шэфскую работу з піянерамі і падлеткамі, для чаго ў мінулым годзе працавала 5 пепедатрадаў.

Выдатна ў гэтым годзе выступіў наш факультэт на аглядзе-конкурсе мастацкай самадзейнасці універсітэта. Мы па праву заваявалі 1-е месца.

Адна з важных праблем у рабоце камітэта камсамола факультэта — працоўнае выхаванне. У гэтым годзе на факультэце дзейнічала 8 СБА і 10 ССГА. Сельскагаспадарчыя атрады выканалі аб'ём работ на суму 175 тысяч рублёў. У атрадах вялася вялікая грамадская работа. Толькі ў рабоце агітбрыгад СБА ўдзельнічалі 93 чалавекі. Імі дадзена 99 канцэртаў, 48 лектараў прачыталі 176 лекцый. Сярод СБА трэба адзначыць баямаўскі атрад імя акадэміка Нікольскага. У цяперашні час камітэт камсамола працягвае весці актыўную работу па ўдасканаленню на факультэце працоўнага выхавання.

Такім чынам, масавыя мерапрыемствы, якія праводзіліся ў ходзе Ленінскага заліку, заслугоўваюць адабрэння. Але савет па ГПП не аслабляе сваёй дзейнасці на працягу ўсяго года. Перыядычна заслухоўваюцца на камітэце камсамола факультэта, камсамольскім бюро справаздачы сакратароў камсамольскіх арганізацый груп, курсаў, аддзяленняў аб ходзе ГПП і Ленінскага заліку. Пастаянна студэнты трымаюць справаздачы на камсамольскіх сходах аб выкананні ўзятых абавязацельстваў.

Камітэт камсамола гістарычнага факультэта прыкладае ўсе намаганні, каб і далей удасканальваць арганізацыю на факультэце ГПП і Ленінскага заліку.

**А. КАЧУРКА,**
**студэнтка II курса гістфака.**



**Ідзе вучоба камсамольскага актыву. Фота М. Дубовіка.**

**...І ПЯЦЬ СТУДЭНЦКІХ ГАДОЎ**

## ДА СВАЁЙ МЭТЫ

Я назіраю за ёй збоку і адкрываю ўсё новыя, незнаёмыя мне рысы, хоць ведаю Люду Стасюкевіч даўно, яшчэ з таго дня, калі здавалі ўступныя экзамены. Яна — на геаграфічны, а я — на факультэт журналістыкі.

...Першая студэнцкая сесія. Першае сур'ёзнае выпрабаванне. Люда яго вытрымала на выдатна.

Сваёй мэты яна дабівалася ўпарта. Не ўдалося паступіць адразу пасля заканчэння школы — пайшла працаваць на Аршанскі інструментальны завод. А вечарамі займалася, паўтарала школьную праграму.

...Зараз у аўдыторыі ціха. Ідзе пасяджэнне савета выдатнікаў геаграфічнага факультэта. Узначальвае яго вось ужо другі год Люда Стасюкевіч. Абмяркоўваюць план работы савета. Прапановам, здаецца, няма канца.

— Вось бачыш, зусім мала мне застаецца зрабіць: толькі запісаць іх прапановы. Рабяты нашы — ініцыятыўныя!

Усміхаюся, бо ведаю: не толькі запісаць трэба. Прыйшоўшы дамоў, некалькі разоў узважыць яна вартасць кожнай прапановы, успомніць спрэчкі вакол яе. І вось на паперы — канкрэтныя шляхі ажыццяўлення. Шмат работы...

— Цікава табе вучыцца?

— Вядома, цікава. І ведаеш, чаму? Глянь на іх — маіх сяброў. Вясёлыя і сумныя, жыццярадасныя і засяроджаныя, разгубленыя і ўважлівыя, бескампрамісныя — розныя. З імі весела і добра, яны заўсёды побач.

— Наш староста — самы лепшы,— з гордасцю гавораць яе сябры.

...Дзверы з папераджальнай таблічкай «Ціха, ідзе экзамен» расчыняюцца. На парозе — Люда. Радасна і крыху стомлена ўсміхаецца.

У ведамасці — першая пяцёрка. Пачатак добры.

— Рабяты, дык ідзём пасля экзамена ў кіно? Бяру білеты на ўсю групу...

**Н. МАРКЕВІЧ,**
**студэнтка журфака.**

● КАЛЕКТЫЎ: ПРАБЛЕМЫ СТАНАЎЛЕННЯ

# НЕ ЗАМЫКАЦЦА Ў САБЕ

ПЕРШЫ дзень у ВНУ, першае знаёмства з выкладчыкамі, першыя ўражанні... Як шмат радаснага і хвалюючага заключана ў гэтым! Ну і, вядома ж, першае знаёмства з групай, з тымі, з кім прыйдзецца дзяліць усе радасці і непрыемнасці на працягу пяці гадоў вучобы.

І вось — новая група. Прыгледзьцеся да яе паводзін. Здавалася б, сабраліся ўсе незнаёмыя. Але прайшло некалькі першых гадзін заняткаў—і пачынаюць нараджацца «нефармальныя» групы з 3 — 4 чалавек: на перапынку імкнуцца трымацца бліжэй адзін ад аднаго, сядзяць таксама побач.

Ці будзе гэты стыхійна ўтвораны «калектыў у калектыве» існаваць доўга, прыцягваць у сябе іншых—час пакажа. Але пакуль ён ёсць, і не адзін. Іх некалькі. У кожным свой мікраклімат, свае крытэрыі адзнакі асобы, свае лідэры.

А што калі ўся група — адзін «нефармальны» калектыў? Ці магчыма гэта? У прынцыпе — магчыма! Пакуль — малаверагодна. Але няпроста сабраць разам моладзь з блізкімі інтарэсамі, узроўнем духоўнага развіцця, жыццёвымі ўстаноўкамі... Крытэрыяў асобы настолькі шмат, што нават самым лепшым тэстам нельга ахапіць усю яе складанасць і шматграннасць. І тут слова за псіхолагамі. Ім па плячу рашыць гэту задачу — задачу фарміравання акадэмічнай групы з усімі задаткамі дружнага, маналітнага калектыву.

А так ці магчыма стварыць сапраўдны калектыў? Лічым, што можна. Паспрабуем пацвердзіць свае меркаванні фактамі з жыцця нашай групы.

Вось ужо чацвёрты год мы займаемся разам. Састаў нашай групы не падбіраўся па якіх-небудзь псіхалагічных тэстах — на аддзяленне біяхіміі набіраецца кожны год 25 чалавек — адна акадэмічная група. Вядома, першыя тыдні заняткаў ішла ўзаемная «прыцірка» адзін да аднаго, стварэнне тых жа «нефармальных» груп. Усё гэта было натуральна — у акадэмічнай групе сабраліся людзі рознай падрыхтаванасці, рознага ўзросту, рознага жыццёвага вопыту.

Але, нягледзячы на ўсе гэтыя «рознасці», створаныя мікракалектывы не замкнуліся ў сабе. Тут значную ролю адыграла першая «бульба». Сумесная праца, агульная радасць кароткіх гадзін адпачынку, пераадоленне неспадзяваных бытавых цяжкасцей — усё гэта здружыла групу і дапамагло адказаць на пытанне «хто ёсць хто»; бо іменна ў працы раскрываецца чалавечы характар. Так быў зроблены добры задзел па фарміраванню ў нашай групе здаровых, прынцыповых адносін. Потым першая сесія, першая летняя практыка... І зноў «бульба»— але ўжо другая, а значыць, і менш цяжкая: бо там ужо былі не проста 25 студэнтаў, а калектыў!

І вось ужо чацвёрты год разам. Якія ж вынікі? Самае важнае тое, што, прайшоўшы праз гэтыя цяжкія гады вучобы, мы захавалі адзін да аднаго пачуццё спагадлівасці і добразычлівасці.

Верыцца, што назаўсёды захаваюцца ў нас гэтыя самыя чалавечыя якасці.

**Г. ЛЮБІН,**
**І. ПІКУЛЕВА,**
**студэнты IV курса біялагічнага факультэта.**

# ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА. ШТО ЗРОБЛЕНА?

**20 СНЕЖНЯ 1979 ГОДА ў нашай газеце быў змешчаны матэрыял «Звычайная субота», у якім выказваліся нараканні на работу пасажырскіх ліфтоў і студсавета ў інтэрнаце № 2. Рэдакцыя атрымала адказ каменданта інтэрната № 2 П. А. Дудкі:**

«Паведамляю, што гэты матэрыял абмеркаваны адміністрацыяй інтэрната сумесна з ліфцёрамі. Адначасова ён разгледжаны на пасяджэнні студсавета.

У ходзе абмеркавання быў распрацаваны графік работы ліфтоў, які ў цяперашні час вывешаны ў холе на першым паверсе. Графік складзены ў адпаведнасці з інструкцыяй па эксплуатацыі ліфтавога абсталявання і графікам работы ліфцёраў.

У інтэрнаце № 2 у эксплуатацыі знаходзяцца тры ліфты: адзін, як правіла, знаходзіцца на рамонце, або чарговым тэхабслугоўванні. Рамонт ліфтавога абсталявання здзяйсняе згодна з дагаворам спецслужба «Ліфтрамонт». У іх не заўсёды ёсць неабходныя для рамонту запасныя часткі. Таму ў асноўным у інтэрнаце адначасова працуюць два ліфты. Бывае, што з-за інтэнсіўнай эксплуатацыі са строю выходзяць два ліфты, але адзін пастаянна працуе. Ліфцёры працуюць у дзве змены па 7 гадзін. Выхадны дзень — нядзеля.

Што датычыць культурна-масавага адпачынку студэнтаў, то тут ёсць шэраг цяжкасцей. У інтэрнаце адсутнічае зала, спецыяльна прадугледжаная для гэтых мерапрыемстваў. Функцыяніруюць толькі тры чытальныя залы, усе астатнія і іншыя падсобныя памяшканні ў сувязі з рамонтам інтэрната заселены студэнтамі.»

**Студсавет інтэрната адказ пакуль не даслаў.**

**Рэдакцыя яшчэ раз напамінае студсавету інтэрната № 2: калі закончыцца гульня ў маўчанне!**





# ВЕЧНАЯ СЕСІЯ

ФОТАРЭПАРТАЖ





**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

ходзіць з аўдыторыі і замест адказу на пытанне «ну, як?» выкідвае ўверх рукі з усімі пяццю пальцамі. Лішнім будзе гаварыць, што зіхаціць яго твар, як начышчаны пятак.

Усё ясна. Першакурснік. Першы год, першая сесія, першы экзамен, першая пяцёрка.

Тыя, каму трэба здаваць у апошні раз, паводзяць сябе ўпэўнена і спакойна. Яны ўжо ўсё ведаюць. Праўда, калі-нікалі экзаменатар бярэ пад сумненне гэты факт, адпаведным чынам адзначаючы сваю думку ў залікоўцы.

Што ж зробіш? Давядзецца яшчэ рабіць адну спробу. Сесія працягваецца вечна. Нават пасля заканчэння універсітэта давядзецца здаваць гэтую сесію, праўда, у іншых варыяцыях і формах. І не выкладчыку, а жыццю. Гэта ўжо складаней. Хаця б таму, што здаць другі раз экзамен часта не з'яўляецца магчымым.

Час і прастора. Час і студэнты. Усё мяняецца. Першакурснікі становяцца пяцікурснікамі, апошнія — выкладчыкамі. Толькі сесія мала чым мяняецца. Як і спрадвеку — яна строгая, няўмольная, патрабавальная. І лепш за ўсё яе здаваць з першага разу. І ва універсітэце, і ў жыцці.

**М. ДУБОВІК,**
**Фота аўтара.**

# КАХАННЕ І ШЛЮБ СЁННЯ

**— аб гэтым ішла гаворка на дыспуце, які нядаўна быў арганізаваны бібліятэкай БДУ і геаграфічным факультэтам.**

**На дыспуце абмяркоўваліся пытанні аб крытэрыі выбару мужа і жонкі, асноўныя патрабаванні да культуры дашлюбных адносін, умовы адаптацыі да сумеснага жыцця маладой сям'і, маральна-псіхалагічны клімат савецкай сям'і. У дыспуце прынялі ўдзел кандыдат філасофскіх навук, выкладчык марксісцка-ленінскай этыкі П. М. Савасцёнак, загадчык кафедры псіхалогіі Р. І. Вадэйка, выкладчыкі і студэнты геаграфічнага факультэта.**

У праграме Камуністычнай партыі ўказана, што пры камунізме адносіны паміж людзьмі ў сям'і не будуць звязаны нікімі матэрыяльнымі разлікамі, а цалкам будуць заснаваны на пачуццях кахання і ўзаемапавагі. Калі памятаць аб будучым, то найбольш ясна становіцца, якімі павінны быць адносіны людзей у сям'і сёння. Розныя існуюць крытэрыі выбару мужа і жонкі — і пачуцці, і сходнасць інтарэсаў, і агульная мэта. Таму і ўзрастае, як адзначыў вядучы дыспуту П. М. Савасцёнак, колькасць незадаволеных шлюбаў, зараз часта можна сустрэць недастатковы падыход да крытэрыя выбару мужа і жонкі. Патрэбна настроенасць на шлюб, наяўнасць пэўных чалавечых якасцей, падрыхтаванасць матэрыяльная і маральная.

Асабліва вострую дыскусію выклікала пытанне аб культуры дашлюбных адносін. Галоўная роля тут належыць дзяўчыне, жанчыне, як і ў сямейных адносінах. Асаблівую трывогу выклікае праблема пакінутых дзяцей. Шлюб без шлюбу, сям'я без сям'і — так можна назваць гэтыя адносіны.

Свабодна, па сэрцу выбірае сабе наш чалавек спадарожніка жыцця, аднак свабода гэта да многага абавязвае. Вядома, што некаторыя маладыя людзі разуменне свабоды трактуюць няправільна, прыкрываючы сваю маральную разбэшчанасць, лёгкадумнасць. Але наша вялікая мэта — барацьба за ўмацаванне і завяршэнне будаўніцтва камунізму — несумяшчальна з непавагай да жанчыны, тым больш з маральнай неахайнасцю. Гэта павінна разумець большасць сучаснай моладзі. Вядома, што па характару адносін мужчыны да жанчыны можна меркаваць аб ступені агульнай культуры чалавека. Таму і барацьба за дастойныя адносіны да жанчыны непадзельна ад барацьбы за выхаванне чалавечай вартасці і гонару ў самой жанчыны.

Па даных сацыёлагаў 75 працэнтаў тых, хто ўступіў у шлюб, лічаць галоўным крытэрыем шлюбу каханне. Але, як сказаў паэт, «любоўная лодка разбілася аб быт». Чаму гэтак? Розныя густы, звычкі, погляды. Да шлюбу мы імкнёмся здавацца лепей, каб спадабацца будучаму спадарожніку жыцця. А ў шлюбе спасцігае расчараванне. Складаны працэс прыціркі характараў. Патрэбна адзначыць, што ў нас пушчаны на самацёк пытанні падрыхтоўкі да сямейнага жыцця. Мужчына, не падрыхтаваны да паводзін у сям'і, нярэдка скатваецца да патрыярхальных адносін.

Неабходнасць далікатна, тактоўна падыходзіць да многіх сямейных праблем мае вялікае значэнне. Трываласць шлюбу, хараство і надзейнасць у адносінах маладых вызначаюцца маральнымі якасцямі людзей, іх здольнасцю кахаць, даражыць каханым чалавекам, уменнем знайсці з ім агульны жыццёвы шлях. Гэта і стала вынікам цікавай гутаркі выкладчыкаў і студэнтаў геаграфічнага факультэта.

**Н. КАВЕРЫНСКАЯ,**
**метадыст бібліятэкі БДУ імя У. І. Леніна.**

# ДЫСКАТЭКА: ЗДАБЫТКІ, ПОШУКІ, ПРАБЛЕМЫ

*Гутарку з удзельнікамі ўсесаюзнага злёту дыскатэк, які прайшоў нядаўна ў маладзёжным кафе «Дыска» горада Асбеста Свярдлоўскай вобласці, студэнтамі фізічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна Валерыем Кірыльчыкам і Дзмітрыем Гаховічам вядзе наш карэспандэнт С. Лыскавец.*

**Карэспандэнт: Дыскатэка фізічнага факультэта адна з лепшых ва універсітэце. Але, як вядома, яна далёка не адзіная ў рэспубліцы. Чаму асбестаўцы, арганізатары такога сур'ёзнага і адказнага, а самае галоўнае, незвычайнага і цікавага мерапрыемства, запрасілі да сябе ў госці іменна членаў вашай факультэцкай дыскатэкі!**

**В. Кірыльчык:** Напэўна, асбестаўцы даведаліся пра нас з невялікай заметкі, якая была надрукавана ў восьмым нумары часопіса «Студенческий меридиан» за мінулы год. У ёй паведамлялася, што на фізічным факультэце нашага універсітэта існуе дыскатэка, кожнае пасяджэнне якой вызначаецца тэматычнай разнастайнасцю і праходзіць заўсёды цікава. Хто напісаў гэтую заметку, мы не ведаем, але вельмі ўдзячны, і асабліва зараз, пасля паездкі на злёт, яе аўтару. Бо тое, што мы ўбачылі там, уразіла, ўсхвалявала нас.

**Карэспандэнт: Усхвалявала ў якім сэнсе!**

**В. Кірыльчык:** У сэнсе таго, што можна зрабіць са звычайнай дыскатэкі, калі вельмі сур'ёзна і ўдумліва падысці да яе работы. Добры прыклад таму — асбестаўскі дыскаклуб «У нас, маладых». Гэта сапраўдная творчая арганізацыя. Прычым арганізацыя грамадская, якая аб'ядноўвае на добраахвотных пачатках аматараў літаратуры, мастацтва — наогул моладзь, якая захапляецца тэхнічнай і мастацкай творчасцю, музыкай і танцамі. Дыскаклуб «У нас, маладых» створаны гаркомам ВЛКСМ для моладзі горада. Цікава, што першы сакратар гаркома камсамола Анатолій Васільевіч Пагадаеў сам з'яўляецца членам савета дыскатэкі і на працягу усяго злёту прымаў у яго рабоце самы актыўны ўдзел.

**Карэспандэнт: Гэта, безумоўна, сведчыць аб тым, што агульнае кіраўніцтва дыскаклубам «У нас, маладых» і ініцыятыва зыходзіць не «знізу», як гэта робіцца ў большасці нашых дыскатэк, а «зверху».**

**Д. Гаховіч:** Так. Дакладней кажучы, у асбестаўцаў існуе трывалая сувязь з камсамольскай арганізацыяй горада, якая ў сваю чаргу вельмі зацікаўлена ў развіцці дыскатэчнага руху. Адсюль, як гаворыцца, і адпаведны вынік. Толькі за тры гады свайго існавання дыскаклуб «У нас, маладых» наведала каля 30 тысяч юнакоў і дзяўчат. Было праведзена звыш 300 праграм, у якіх змястоўна і цікава расказвалася аб творчасці вядомых кампазітараў, выканаўцаў, ансамбляў. Акрамя таго, дыскаклуб мае свой статут, друкуе праграмы пасяджэнняў, запрашальныя білеты .Лепшыя члены дыскаклуба ўзнагароджваюцца спецыяльнымі дыпломамі.

**Карэспандэнт: Дзіма, вось ты гаварыў пра статут дыскаклуба асбестаўцаў. На мой погляд, гэта нешта новае. Раскажы, калі ласка, аб ім падрабязней.**

**Д. Гаховіч:** Я не зусім згодны. Статут дыскаклуба—гэта з'ява не новая. Напрыклад, у нашай фізфакаўскай дыскатэкі таксама ёсць свой статут. Але ён яшчэ слаба распрацаваны і таму значна адрозніваецца ад статута асбестаўцаў. У іх ён з'яўляецца асноўным законам жыцця дыскатэкі. Дастаткова адзначыць, што на справаздачна-выбарным сходзе дыскаклуба «У нас, маладых», які адбыўся ў верасні мінулага года, была зацверджана яго другая рэдакцыя. Статут складаецца з дзевяці асноўных пунктаў. Самы першы з іх — «Дыскаклуб і камсамол». У ім адзначаецца, што дыскасправа — рух маладзёжны. Ролю яго лідэра і арганізатара адыгрывае камсамол.

**Карэспандэнт: А хто можа быць членам дыскаклуба «У нас, маладых»!**

**Д. Гаховіч:** Любы чалавек, які прызнае статут дыскаклуба і выконвае грамадскую работу, дакладней кажучы, той, хто займаецца дыскасправай. Прыём у члены дыскаклуба праходзіць у індывідуальным парадку, прычым абавязковай умовай пры рашэнні пытання аб прыёме з'яўляецца прыналежнасць чалавека да радоў ВЛКСМ. Кожны член дыскаклуба мае права звяртацца з пытаннямі і заявамі у любы камсамольскі орган, можа карыстацца бібліятэкай, слайдатэкай, фільматэкай і рабіць запісы. Таксама кожны з членаў дыскаклуба можа быць накіраваны у творчую камандзіроўку, і яму дазваляецца наведваць любую праграму дыскаклуба бясплатна.

**Карэспандэнт: Значыць, каб папасці на тую ці іншую праграму дыскаклуба, трэба плаціць грошы!**

**Д. Гаховіч:** Безумоўна. Грашовыя сродкі дыскаклуба складаюцца толькі з даходаў за ўваходныя білеты на дыскатэкі. А набыццё неабходных для дыскаклуба тэхнічных сродкаў і матэрыялаў праводзіцца па просьбе савета дыскаклуба і па рашэнню бюро гаркома камсамола, бо ўся фінансава-гаспадарчая дзейнасць дыскаклуба ажыццяўляецца праз бухгалтэрыю гаркома ВЛКСМ.

**Карэспандэнт: Наколькі мне вядома, ваша факультэцкая дыскатэка не мае такой падтрымкі. А між іншым аб развіцці дыскатэчнага руху, як сродку выхавання ў моладзі палітычнай, духоўнай сталасці і культуры было падкрэслена на XVIII з'ездзе ВЛКСМ.**

**В. Кірыльчык:** На жаль, часта здараецца так, што творчая ініцыятыва не выклікае адпаведнага водгуку ў камсамольскіх арганізацыях, якія павінны цікавіцца нашай работай. Вось і атрымліваецца, што дыскатэка фізфака існуе амаль на пустым месцы. У нас няма апаратуры, няма адпаведных памяшканняў для правядзення дыскатэк. Усё даводзіцца рабіць самім. І звычайна кожнае пасяджэнне дыскатэкі ператвараецца ў вечар адпачынку, на якім можна проста патанцаваць ці паслухаць добрую музыку. А гэта далёка не тое.

НАШ КРУГЛЫ СТОЛ

Трэба яшчэ шмат працаваць. Толькі не паасобку, а разам. Разам з усёй камсамольскай арганізацыяй універсітэта. Тым больш, што нам ёсць з каго браць прыклад у гэтым плане.

**Карэспандэнт: Валерый, злёт удзельнікаў дыскатэк разглядаў, напэўна, і такое важнае пытанне, як развіццё форм правядзення дыскатэк. Па якіх асноўных напрамках ідзе зараз пошук гэтых форм! Што ўжо зроблена!**

**В. Кірыльчык:** Спачатку я хачу задаць вам сустрэчнае пытанне: колькі вы ведаеце такіх форм?

**Карэспандэнт: Толькі адну — дыскатэку-лекторый, якая ўключае ў сябе паказ слайдаў, ці, інакш кажучы, слайд-фільма з адпаведным музычным афармленнем і каментарыем.**

**В. Кірыльчык:** Так лічылі і мы, пакуль не пазнаёміліся там, на злёце, з іншымі, зусім новымі і цікавымі формамі правядзення дыскатэк.

Дыскатэка-лекторый — гэта самы просты, самы звычайны і самы распаўсюджаны варыянт дыскатэкі. Акрамя таго, існуе і зараз набывае вялікую колькасць прыхільнікаў больш складаны па сутнасці і рашэнню варыянт — дыска-панарама, або дыска-плакат. Яго і прадэманстраваў на злёце асбестаўскі дыскаклуб «У нас, маладых». Праграма называлася «Яны страляюць па зорках». У ёй расказвалася аб актах тэрору, якія ажыццяўляліся рэакцыйнымі коламі ЗША супраць прагрэсіўных амерыканскіх дзеячаў. Гэта праграма паказвае ўсю хлусліваcць славутага міфа аб «свабодзе і дэмакратыі» буржуазнага грамадства. У праграме была выкарыстана музыка з амерыканскага кінафільма «Начны экспрэс», які аранжыраваў вядомы музыкант Джоржы Марадзёр. Гучала ў праграме музыка групы «Пінк Флойд» з альбома «Адваротны бок Месяца» і «Песня аб сумленні», якую выконваў А. Градскі. Але, бадай, больш за усё уразіў нас спектакль «Жыў чалавек...» тэатра-студыі дыскаклуба «Кантакт» горада Свярдлоўска. У яго аснову пакладзена дзейнасць групы «Дзверы» і яе лідэра Джэймса Дугласа Морысана. Спектакль закранае канец 60-х і пачатак 70-х гадоў, калі моладзь на Захадзе праз музыку хацела вырашыць шматлікія сацыяльныя праблемы, уласцівыя капіталістычнаму грамадству. Гэты бунт, гэтая музычная рэвалюцыя стала трагічнай як для лідэра «Дзвярэй», так і для ўсёй групы.

**Карэспандэнт: Такім чынам, самая звычайная дыскатэка-лекторый можа ператварыцца ў дыскатэку-плакат ці дыскатэатр!**

**Д. Гаховіч:** Так. Але не толькі. Вось, напрыклад, дыскатэкі з Чалябінска і Арцёмаўска значна расшырылі варыянт дыскатэкі-лекторыя, узбагаціўшы яе элементамі харэаграфіі. Можна лічыць, што гэта ўжо трэцяя форма—дыскабалет. Наогул, нельга забываць і аб сінтэзе ўсіх форм.

**Карэспандэнт: А якую праграму прапанавала фізфакаўская дыскатэка!**

**В. Кірыльчык:** Мы прывезлі на злёт звычайную дыскапраграму. Яе тэма: «Станаўленне савецкага джаза ў 20—40-я гады. Спачатку быў паказаны слайдфільм, а потым ішоў каментарый. Дарэчы, за гэты фільм наш слайдзіст Сяргей Дзянісаў, студэнт трэцяга курса, быў узнагароджаны ганаровым дыпломам дыскаклуба «У нас, маладых».

Гэта сведчыць аб тым, што у нас ёсць усе падставы для развіцця. Толькі яшчэ раз паўтараю: нам патрэбна дапамога.

**Карэспандэнт: Вашы пажаданні!**

**Д. Гаховіч:** Хацелася б, каб на старонках нашай газеты «Беларускі універсітэт» часцей паяўляліся матэрыялы аб развіцці дыскатэчнага руху ва універсітэце. Пісалася аб дыскатэках іншых факультэтаў, чым яны жывуць, што іх хвалюе. Наогул, было б вельмі нядрэнна, каб «Беларускі універсітэт» арганізаваў спецыяльную музычную старонку.

**В. Кірыльчык:** А мне вельмі хочацца, і я на гэта спадзяюся, каб у будучым такія злёты ўдзельнікаў дыскаклубаў праходзілі і ў нашым універсітэце. І, карыстаючыся выпадкам, хачу падзякаваць членам асбестаўскага дыскаклуба «У нас, маладых» за гасцінную, цёплую сустрэчу і выказаць шчырае прызнанне першаму сакратару асбестаўскага гаркома камсамола А. В. Пагадаеву, чалавеку, які цвёрда ўпэўнены, што за дыскарухам — будучае.

---

**РЭПАРТАЖ**

# ПАРА НОВАГА РОСТУ

У АДНОЙ са спартыўных залаў БДУ імя У. І. Леніна гучыць музыка, ярка свецяцца неонавыя лямпы, бліщчаць люстры. Каля сотні юнакоў і дзяўчат у лёгкіх трыко развучваюць «Полечку». Ідзе рэпетыцыя падрыхтоўчай групы ансамбля народнага танца «Крыжачок».



«Крыжачку» — 10 год. І ўвесь гэты час ён высока трымае гонар народнага калектыву. Яго выступленні карыстаюцца пастаянным поспехам у нашага гледача, з захапленнем сустракаюць ансамбль у многіх буйнейшых гарадах свету. Зусім нядаўна, напрыклад, па запрашэнню таварыства дружбы «Аўстралія — СССР» «Крыжачок» гастраляваў у Сіднеі, Мельбурне, Перты, Брысбене, Велінгтоне. І на гэты раз сэрцы замежных гледачоў запаланіла тонкая вязь рускіх карагодаў, іскрыстасць беларускага «Крыжачка», безутрымная ліхасць украінскага «Гапака» — увесь рэпертуар ансамбля, які ўвабраў фальклорнае багацце усёй нашай краіны.

— Сапраўды, выступілі мы пасяхова,— гаворыць у перапынку рэпетыцыі кіраўнік ансамбля Мікалай Вікенцьевіч Лапша.— Толькі, на жаль, гастролі гэтыя для многіх пашых танцораў былі развітальнымі: заканчваюць людзі універсітэт, раз'язджаюцца. Зараз у нас — так званы перыяд новага росту. У чацвёрты раз амалоджваецца калектыў. Каля ста першакурснікаў прыйшлі да нас у верасні. Праз 2—3 гады яны, магчыма, навучацца нядрэнна танцаваць,— усміхнуўся Мікалай Вікенцьевіч і, паглядзеўшы на гадзіннік, аб'явіў:

— Дастаткова. Адпачылі. За працу!

Рэпетыцыя працягваецца... Многія пачынаючыя ўжо сёння танцуюць лёгка, свабодна. Іншыя (а такіх большасць) робяць гэта хаця і з захапленнем, але прыкметна горш за сваіх таварышаў.

— Стоп! Стоп! Стоп!— Мікалай Вікенцьевіч падыходзіць да адной з дзяўчат.— Ніна, ты зноў не слухаеш музыку... Збіцца з рытму — значыць сапсаваць увесь танец! Разумееш? Вось і добра. Усё спачатку! І — раз, два, тры...

— М. В. Лапша вучыць танцаваць усіх жадаючых,— тлумачыць дырэктар студэнцкага клуба БДУ Лідзія Пятроўна Лазарава, якая прысутнічае на рэпетыцыі.— І гэта можна толькі вітаць. Успомніце, яшчэ старажытныя грэкі сцвярджалі: кожны чалавек павінен умець спяваць, танцаваць і вершы складаць. Кожны! Іменна таму шлях у «Крыжачок» адкрыты для ўсіх.

Зноў перапынак. Падыходжу да адпачываючых танцораў і цікаўлюся, што ім вядома аб першым пакаленні «Крыжачка».

— Вельмі многа,— гаворыць Сяргей Багдановіч.— «Старычкі» нярэдка бываюць тут. Часцей за ўсіх — Ірына Трыгубовіч, Аляксей Дзехцяроў, Людміла Грышчанка, Ірына Аталевіч, Таццяна Зямяніна. Амаль усе яны — кіраўнікі самадзейных танцавальных калектываў школ, прадпрыемстваў, інстытутаў.

Рэпетыцыя працягваецца. Вельмі доўгая і вельмі нялёгкая. «Крыжачок» запрошаны на адкрыццё «Алімпіяды-80» у Маскву, і не выключана магчымасць, што ўдзельнікамі гэтай паездкі стануць найбольш таленавітыя «навічкі». Ім працягваць справу старэйшых таварышаў.

**В. ЛАПІН,**
студэнт журфака.

**На здымку:** перад чарговым выступленнем.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

10 СТУДЗЕНЯ 1980 г.

Заказ № 2. АТ 15004

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 22-07-19

В. а. рэдактара В. П. ВАРАБ'ЁЎ